№ 09 (458)
Сакавік 2013 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ Музеі: гісторыя педагогаў, гісторыя адукацыі – стар. 3

☞ Асоба ў краязнаўстве: старшыня Уладзімір Гілеп – стар. 4

☞ Спадчына: ізабелінскі храм Святога Архангела Міхаіла – стар. 5

Фота Наталі КУПРЭВІЧ

Школьнае краязнаўства

Новыя экскурсаводы

У музей «Вілейшчына літаратурная» прыйшлі новыя экскурсаводы. Дакладней, не прыйшлі, а далучыліся да кагорты тых, хто працуе не першы год. Малодшыя школьнікі паспрабавалі свае сілы – прадставілі сябе і «сваіх» аўтараў прысутным аднакласнікам, бацькам і настаўнікам.

Безумоўна, хвалявання было многа: хаця б не збіцца пры выступленні, каб не спазніліся таты і мамы, каб настаўніца магла ганарыцца імі, каб месца ўсім хапіла. Я хвалявалася не менш за сваіх выхаванцаў – гэта быў сапраўдны экзамен для нас. Хочацца назваць прозвішчы юных актывістаў: Ліза Артамонава, Уладзімір Буркевіч, Вікторыя Васінкевіч, Антон Гаўрылік, Святлана Руткоўская, Марыя Шмаргалава, Наталля Камінская, Анастасія Пятрова, Кірыл Баравы, Дзмітрый Трубач, Ягор Молчан, Любоў Юрэвіч, Алена Ясінская, Мікіта Ляшковіч, Анастасія Кастрычэнка, Уладзіслаў Кірпік, Віялета Пятрова, Аліна Маскалевіч. І хаця гэтыя экскурсаводы яшчэ не маюць вопыту, але да справы паставіліся вельмі сур'ёзна і адказна. Акрамя аповеду пра вядомага чалавека прадставілі вершы, невялічкія сцэнкі з творчасці Барыса Манцэвіча, які зусім нядаўна адзначыў свой 70-гадовы юбілей і якога мы чакаем на сустрэчу ў нашым музеі. Увогуле, мы чакаем усіх, зацікаўленых Вілейшчынай літаратурнай.

У канцы свята Антон Гаўрылік уручыў усім выступоўцам кніжачкі з казкамі Дзмітрыя Новікава, якія пісьменнік пакінуў у школе для патрэбаў музея. Бацькі, не хаваючы расчуленасці, пажадалі творчых поспехаў музею і яго шчырым сябрам.

Роза ШЭРАЯ,
кіраўнік музея «Вілейшчына літаратурная»
Ільянскай СШ імя А.А. Грымаця Вілейскага раёна

На тым тыдні...

✓ **25 лютага** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася **прэзентацыя кнігі Алеся Пісьмянкова «Не знікай»**, прымеркаваная да дня нараджэння паэта.

«Не знікай», – так звычайна казаў на развітанне сябрам Алесь Пісьмянкоў, і гэтыя словы гучалі як спадзяванне на будучыя сустрэчы. Пранікнёныя і светлыя радкі паэта і сёння знаходзяць водгук у сэрцах чытачоў, а жыццё яго, якое, на жаль, заўчасна абарвалася, працягваецца ў яго творах. Усе, каму пашчасціла сутыкнуцца з Алесем Уладзіміравічам, памятаюць яго светлым і шчырым, узнёслым і рамантычным чалавекам. Ён вымяраў сваё жыццё і свае творы шкалою каштоўнасцяў, напрацаваных нашымі продкамі, і заўсёды быў гатовы аддаць душэўную цеплыню людзям.

✓ **28 лютага** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа адкрылася **выстаўка «Старонкі гісторыі паўстання 1863–1864 гг.»**, дзе прадстаўлена больш за 100 друкаваных і рукапісных дакументаў XIX–XXI стст. з фондаў бібліятэкі: апісанні ваенных дзеянняў, зборнікі матэрыялаў справаводства і публіцыстыкі, мемуары, даследаванні айчынных і замежных навукоўцаў. Бібліятэкаю падрыхтаваны відэафільм «Паўстанне 1863 года».

Наведнікі выстаўкі змаглі ўявіць атмасферу працы над тэмай паўстання 1863–1864 гадоў. Імпрэза арганізаваная бібліятэкай сумесна з Польскім Інстытутам у Мінску.

✓ **28 лютага** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ў рамках міжнароднага праекта «А. Пушкін і А. Міцкевіч. Скрозь далечыню стагоддзяў...» (прысвечанага 215-годдзю з дня нараджэння паэтаў) адбыліся **майстар-класы па музейнай педагогіцы «У Вас у гасцях Пушкінскі запаведнік»**, якія праводзіліся для беларускіх калег-музейшчыкаў і педагогаў навуковыя супрацоўнікі Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-літаратурнага і прыродна-ландшафтнага музея-запаведніка А.С. Пушкіна «Міхайлаўскае».

✓ **1 сакавіка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылі выстаўку **«Салон-атэлье пачатку XX стагоддзя»**, прымеркаваную да Міжнароднага жаночага дня. Музей запрасіў наведнікаў зазірнуць у такі салон, дзе дэманструюцца сукенкі, элементы адзення, дамскія аксесуары «цудоўнай эпохі», а прадметы інтэр'еру (прасы, швейныя машынкі і інш.) дазволілі акунуцца ў інтэр'ер майстэрні мадысткі таго часу.

Выстаўка працуе да 11 сакавіка.

✓ **1 сакавіка** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва прайшла **творчая сустрэча з Уладзімірам Цэслерам** з нагоды яго выставачнага праекта «Практыка рынкавага рэалізму». Аўтар разважаў над прадстаўленымі на выстаўцы жывапісам, скульптурай, арт-аб'ектамі і іншымі праявамі яго крэатыўнасці і схільнасці да парадоксаў.

✓ **1 сакавіка** супрацоўнікі і наведнікі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры першы вясновы дзень сустрэлі разам з выдатным творчым дуэтам «Аляксандра і Канстанцін», які прэзентаваў **чацвёрты паўнафарматны дыск «M1»**, назву якому дала інструментальная кампазіцыя Road M1 (Траса M1).

Дыск уключае 14 трэкаў – песні на беларускай, рускай і англійскай мовах, а таксама інструментальныя кампазіцыі.

Яркая зорка на небасхіле беларускай паэзіі

«"Я той хто шлях і хто ідзе па ім" – так калісьці Алесь Разанаў, беларускі паэт-наватар, вызначыў свой жыццёвы дэвіз». Такімі словамі пачалася літаратурная імпрэза, прымеркаваная да 65-годдзя А. Разанава, якая прайшла 26 лютага ў ВДУ імя П.М. Машэрава ў рамках тыдня факультэта беларускай філалогіі і культуры. На літаратурную вечарыну завіталі студэнты з розных факультэтаў, выкладчыкі і ўсе, хто неабыякавы да беларускага слова.

Пазнаёміць усіх ахвочых з творчасцю паэта вырашылі студэнты 5-га курса факультэта беларускай філалогіі і культуры на чале з выкладчыкам кафедры літаратуры Ірынай Саматой. Яны падрыхтавалі прэзентацыю, дзякуючы якой госці даведаліся пра жыццёвы і творчы шлях А. Разанава. Таксама на мерапрыемстве студэнты чыталі вершы, спявалі песні. Так, у выкананні Аляксандра Камовіча прагучала песня пад гітару «Гліняныя чалавечкі» на словы з версэта паэта-юбіляра. Марыя Санько прачытала сваё эсэ, у якім выказала любоў да творчасці паэта. На імпрэзу завітаў і колішні аднагрупнік А. Разанава Фёдар Шкіранда. Ён расказаў гасцям пра гады навучання з паэтам, прывёў цікавыя факты з жыцця аднагрупніка.

– Талент мастака слова вядомы далёка за межамі Беларусі, бо яго актыўная ўласная паэтычная творчасць узаемадзейнічае з перакладчыцкай дзейнасцю. У А. Разанава шмат перакладаў з нямецкай, англійскай, польскай, чэшскай, балгарскай, латышскай, грузінскай і іншых моваў свету. Творца не абмяжоўваецца пісаннем традыцыйных вершаў. Упершыню ў літаратуры ім прыдуманыя такія формы, як версэты, пункціры, зномы, квантэмы, вершаказы. У разанаўскіх творах нярэдка чытач можа сустракаць адсутнасць знакаў прыпынку – так творца дае магчымасць стаць яго сааўтарам, кожнаму па-свойму прачытаць і асэнсаваць верш – расказала Ірына Саматой. – Алесь Разанаў – гэта яркая зорка, якая ззяе на небасхіле не толькі беларускай, але і сусветнай літаратуры.

Надзея ЗУЕВА,
студэнтка ВДУ
імя П.М. Машэрава

У Купалавым Доме

Пілотны праект «Гадзіна мастацтва» вызначыў пераможцаў!

9 і 19 лютага ў сценах Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы пілотны праект «Гадзіна мастацтва» аб'яднаў творцаў з Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў, студыі выяўленчага мастацтва Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К. Глебава і проста аматараў творчасці Эрнста Тэадора Вільгельма Гофмана ў стварэнні мастацкіх працаў паводле матываў творчасці выдатнага нямецкага пісьменніка.

Пасля экскурсіі і эксклюзіўнага прагляду мультыплікацыйнага фільма будучыя мастакі, самаму малому з якіх усяго 5 гадоў, змагаліся за магчымасць далучыцца да вялікай кагорты творцаў з розных краінаў і прадставіць свае палотны на радзіме Гофмана. Па выніках праекта журы на чале з мастакамі Усеваладам Швайбам і Андрэем Ярашэвічам вызначыла пераможцаў і ўнагародзіла каштоўнымі падарункамі ад музея Янкі Купалы. Лаўрэатамі конкурсу сталі Агнія Свірыдовіч і Паліна Міцкевіч (Мінская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў), Яна Чарнова, Ганна Плотнікава і Юлія Перагуд (Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя А.К. Глебава).

Спадзяемся, што праект «Гадзіна мастацтва» стане традыцыйным і дапаможа адкрыць яшчэ не адно новае імя.

Вечарынка з нагоды юбілеяў

19 лютага ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылася літаратурная вечарына, прысвечаная памяці выдатных дзеячаў нацыянальнай культуры, творчы і жыццёвы шляхі якіх былі цесна звязаныя са славутай постаццю народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Менавіта ў гэтым годзе шырокая грамадскасць святкуе 135-годдзе з дня нараджэння публіцыста, літаратурнага крытыка Уладзіміра Самойлы, адзначае 120 гадоў з дня нараджэння класіка нацыянальнай літаратуры Максіма Гарэцкага і першай беларускай паэтэсы-лірыка Канстанцыі Буйло.

Адным з першых, хто высока ацаніў паэтычны талент Янкі Купалы быў У. Самойла. Пры яго падтрымцы ў маі 1905 года ў газеце «Северо-Западный край» з'явіўся першы верш песняра на беларускай мове «Мужык».

На працягу ўсяго жыцця шчырыя сяброўскія стасункі звязвалі Янку Купалу і Канстанцыю Буйло. Некалі паэт прасіў яе: «Пішыце яшчэ і яшчэ», – і прысвяціў зусім юнай Костцы верш «Мая думка». Менавіта Янка Купала склаў і адрэдагаваў першы зборнік паэтэсы «Курганная кветка», выдадзены ў Вільні ў 1914 годзе. Тое, што ўжо за савецкім часам пасля выхаду ў Мінску другога зборніка, «Світанне», Канстанцыя Буйло не была рэпрэсаваная, можна лічыць дзівам, якога, аднак, магло не адбыцца, калі б не заступніцтва сяброўкі маладосці – жонкі Купалы Уладзіславы Францаўны.

Сардэчныя адносіны паміж Янкам Купалам і М. Гарэцкім склаліся ў 1918 годзе ў Смаленску. У сваёй «Гісторыі беларускай літаратуры» апошні змясціў біяграфію песняра са словаў самога паэта. Вобраз Янкі Купалы створаны М. Гарэцкім у апавяданні «Фантазія» і рамане «Віленскія камунары». А ў аповесці «Меланхолія», якая мае выразную аўтабіяграфічную аснову, М. Гарэцкі нібы ад сябе перадаў жаданне свайго героя, маладога каморніка, сустрэцца ў Вільні з Янкам Купалам.

Імпрэза ў гасцінным доме песняра, прымеркаваная да юбілеяў, прайшла ў фармаце вечарынкі пачатку XX стагоддзя. Ганна Запартыка, дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, дзе захоўваюцца ўласныя архівы М. Гарэцкага і Канстанцыі Буйло, а таксама Яфім Плаўнік, сын вядомага беларускага пісьменніка Змітрака Бядулі, распавялі наведнікам пра асяроддзе першага народнага паэта Беларусі. Акунуцца ў атмасферу пачатку XX стагоддзя дапамаглі ўдзельнікі беларускага этнафолк гурта «Guda» і вучні дзіцячай музычнай школы № 10 імя Я.А. Глебава. Завяршылася мерапрыемства прэзентацыяй выстаўкі, прысвечанай юбілярам, з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Ала ДРАЖЫНА,
вучоны сакратар
Дзяржаўнага
літаратурнага музея
Янкі Купалы

Сляды матэрыяльнай культуры

Амаль у кожнай сям'і захоўваюцца лісты і дакументы, якія знаёмяць з далёкім мінулым Бацькаўшчыны, дапамагаюць адгарнуць адну з малавядомых старонак гісторыі Беларускай дзяржавы пачатку XX стагоддзя. Так атрымалася і ў маім выпадку, пра што і хачу расказаць.

У маім сямейным архіве захоўваецца перапіска дзядулі з выканаўчымі органамі часоў XX стагоддзя. Але вось як гэта сталася. Аднойчы мой дзядуля Мікалай Аляксандравіч Мякшыла (дарэчы, імя атрымаў у гонар апошняга расійскага цара) захацеў набыць кавалак зямлі, які застаўся ад царкоўнай маёмасці. Каб справа атрымалася, вёў перапіску з земскім павятовым упраўленнем у Маладзечне (1920 – 1930-я гады XX стагоддзя), а таксама з Ваяводскім віленскім упраўленнем. Калі Заходняя Беларусь уваходзіла ў склад Польшчы, справаводства ў вёсцы Лебедзева (сучаснага Маладзечанскага раёна) вялося, вядома, на польскай мове. Таму жыхары атрымлівалі дакументы са сталіцы ваяводства Вільні менавіта на дзяржаўнай мове таго часу (у тым ліку і перапіска дзядулі).


POTWIERDZENIE DLA WPŁACAJĄCEGO
na wpłatę zł 22 gr 15
złotych
gr 15
na konto czekowe w Pocztowej Kasie Oszczędności
Nr. 709225
Właściciel konta:
Rolny odchład w Wilnie
POCZTOWA KASA OSZCZĘDNOŚCI
Podpis urzędnika:
POBRANO OPŁATĘ
zł..... gr.....
LEBEDZIEW
24 I. 1938
P.K.O. Nr. 106

Перапіска цікавая тым, што з яе можна даведацца, колькі каштавала тады зямля (у злотых), а таксама вывучаць гісторыю пячатак і штампаў, якімі, дарэчы, у суседняй Польшчы да сёння карыстаюцца ў банках і іншых установах. А паштовыя маркі таго часу, змешчаныя на гэтых дакументах, зацікавяць філатэлістаў Польшчы і Беларусі (сёння дзяржаўныя органы не карыстаюцца маркамі «Przesylka urzedowa» з выявай белага арла); каліграфісты ж нават пазайздросцяць почырку камісара земскага павятовага ўпраўлення ў Маладзечне, які старанна запаўняў бланкі (пісалі тады алоўкамі альбо чарнільнай ручкай), надрукаваныя ў дзяржаўнай друкарні ў Вільні (1929). Заплаціць можна было праз «Паштовую зберагальную касу», якой і карысталіся жыхары Лебедзева.

Нягледзячы на тое, што ў польскія дакументы няправільна ўпісанае беларускае прозвішча, гэта не паўплывала на факт закупкі лебедзеўскай зямлі, дзе стаяла хата майго дзеда, які пакінуў нашчадкам каштоўныя паперы-сляды нашай агульнай матэрыяльнай культуры.

Ганна МЯКШЫЛА,
кіраўнік музея «Памяць і час»
СШ № 5, г. Ліда


M. R. R.
Wzór Nr. 9.
POWIATOWY URZĄD ZIEMSKI
w Mołodecznie
Dnia 7 I 1933 r.
L. 5476
Do
P. Mieszkuła Mikołaja
i Aleksandra
zam. w Lebiedziewie
Powiatowy Urząd Ziemski powiadamia, że decyzją Prezesa Okręgowego Urzędu Ziemskiego w Wilnie z dnia 31 XII 1929 r. Pan został zatwierdzony na nabycie parceli Nr. o obszarze ok. 0.11 ha z państwowego majątku Gr. Parafiańskiego położonego w gminie Lebiedziewskiej powiecie Mołodeczańskim
Decyzja powyższa jest ostateczną.
~~Celem objęcia tych gruntów w swe posiadanie należy stawić się do Powiatowego Urzędu Ziemskiego w do dnia~~
~~Niestawienie się w tym terminie będzie nieodwołalnie uważane za zrzeczenie się swych praw do kupna, a omawiane grunta zostaną rozdysponowane w inny sposób.~~
Komisarz Ziemski
Druk. Państwowa w Wilnie. Nr. 10798 21 II.29 1000.

Грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры» смуткуе з нагоды смерці 5 сакавіка 2013 года ў Санкт-Пецярбургу **Валянціна Грыцкевіча** – беларускага гісторыка, старшыні Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга і выказвае шчырыя спачуванні сябру Рады БФК Анатолю Пятровічу Грыцкевічу, родным і блізкім нябожчыка.

Музей галіны

Памяць пра педагогаў

У мінскай гімназіі № 12 у 2001 годзе створаны і працуе адзіны ў краіне музей, дзе захоўваюць памяць аб ветэранах педагагічнай працы. Кіраваць Музеем гісторыі адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і гісторыі 12-й гімназіі пашчасціла мне, аўтару гэтых радкоў. Мая педагагічная біяграфія даволі разнастайная: скончыла Акцюбінскае педвучылішча, Уральскі педінстытут і МДПІ імя А.М. Горкага (аддзяленне лектараў па пытаннях этыкі і маралі, факультэт грамадскіх прафесіяў). Стаж педагагічнай працы – 56 гадоў, узнагароджаная многімі граматамі, а таксама, медалём «Ветэран працы». Працавала і намеснікам дырэктара па вучэбнай працы, і дырэктарам СШ № 12, намеснікам дырэктара СШ № 165 і ў мінскім ліцэі № 1.

Ёсць, на жаль, адна праблема. У Пастанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10.06.2006 г. гаворыцца, што «па рашэнні кіраўніка юрыдычнай асобы, у склад якой уваходзіць музей са статусам "народны", для ажыццяўлення музейнай дзейнасці ў структуру дадзенага музея ўводзяцца адна або больш штатных адзінак». Наш музей атрымаў званне «народны» у 2002 годзе, пацвердзіў яго ў лютым 2010-га. Але толькі са студзеня 2013 года ўведзеная стаўка «захавальніка музейных экспанатаў».

Наш музей жыве цікавым творчым жыццём. Тут рыхтуюцца і выдаюцца летапісы аб творчым шляху настаўнікаў «З любоўю да дзяцей» (іх ужо 49). Такія ж летапісы выдадзеныя аб кожным члене Савета ветэранаў педагагічнай працы Маскоўскага раёна, з якім музей супрацоўнічае, і яго старшыні В. Раманчук. Складзеныя летапісы пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. А ўдзел у конкурсе ў намінацыі «Педагогі, ураджэнцы Беларусі, уганараваныя званнем Герой Савецкага Саюза ў гады Вялікай Айчыннай вайны» дазволіла нашым гімназістам-даследчыкам знайсці матэрыял аб 65-і педагогах, якія маюць яго. Праца заняла другое конкурснае месца ў краіне. Матэрыялы захоўваюцца ў нашым музеі, імі часта цікавяцца наведнікі. Падрыхтаваны і летапіс «Заслужаны настаўнік» раёна.

За дванаццаць гадоў свайго існавання музей прыняў каля 15 тысячаў наведнікаў, з якімі працуюць выдатна падрыхтаваныя экскурсаводы. Сярод гасцей былі: 45 дэлегацыяў краінаў свету, 70 кіраўнікоў музеяў розных навучальных установаў, а таксама – 20 наведванняў метадычных і інспектарскіх службаў. Былі ў нас і групы з розных навучальных установаў Мінска і вобласці. Мы супрацоўнічаем з іншымі музеямі сталіцы.

Музей падтрымлівае стасункі з нашчадкамі І. Голубева, імя якога носіць вуліца, дзе размешчаная гімназія № 12. Увесну 2012 года ў Мінскім Палацы дзяцей і моладзі савет музея гісторыі адукацыі арганізаваў выстаўку, прысвечаную 90-годдзю піянерскай арганізацыі. Пошукавыя групы атрымалі заданне знайсці на тэрыторыі краіны помнікі, прысвечаныя настаўнікам – удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, і адзін з такіх помнікаў мы наведалі ў Мар'інай Горцы Пухавіцкага раёна.

Адзін з важных накірункаў працы музея – супрацоўніцтва з ветэранамі педагагічнай працы. Створаны Савет ветэранаў, які супрацоўнічае з саветам ветэранаў педагагічнай працы Маскоўскага раёна г. Мінска: праводзіць сумесныя пасяджэнні, дзе складаюцца планы працы, абмяркоўваюцца важныя пытанні, напрыклад, збор інфармацыі пра ветэранаў педагагічнай працы. Штогод абнаўляюцца спісы ветэранаў, што захоўваюцца ў гімназіі.

Клопат пра ветэранаў ужо даўно стаў справай гонару не толькі членаў савета, але і навучэнцаў. Сябры савета наведваюць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Андрэя Іванавіча Дзеравянку, Ганну Андрэеўну Мікушкіну, Міхаіла Лявонавіча Рэзніка, Марыю Рыгораўну Літвінаву, а з былой партызанкай Тамарай Васільеўнай Сушковай падтрымліваюць цесную сувязь.

Сумесна з ветэранамі праводзім культурна-масавыя мерапрыемствы (Дзень Настаўніка, калядныя сустрэчы, круглыя сталы напярэдадні 8 сакавіка і Дня Настаўніка), дзе абмяркоўваем пытанні дапамогі ветэранам. Арганізуем таксама ўрачыстыя вечарыны, наведваем ветэранаў у бальніцы і праз арганізацыю «Чырвоны крыж» аказваем гуманітарную дапамогу.

А напярэдадні 9 мая мы арганізавалі віншаванне кожнага ветэрана вайны ў іх дома.

Прыемна, што вучні гімназіі цікавяцца і з задавальненнем удзельнічаюць у справах музея, разумеюць патрэбу і адчуваюць адказнасць.

Правялі сустрэчы з аўтарамі падручнікаў: аўтарам «Буквара» А. Клышкам, аўтарамі навучальнага дапаможніка для «эканамічных» класаў В. Церахавым і Н. Кунгуравай, аўтарамі падручнікаў фізікі В. Жылко, А. Лаўрыненка, Л. Марковіч.

Цяпер падобныя музеі адкрытыя ў вёсцы Мікашэвічы Лунінецкага раёна (раённы музей), у Наваполацку (раённы музей), у Дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі (гарадскі музей). У Жодзіна – музей жаночай адукацыі, у Дзяржынску – музей сваёй навучальнай установы (гімназіі № 1) і г.д.

З вышэйсказанага відаць, што музей дзейнічае. Значыць, тут ёсць кіраўнік, а не «захавальнік». Паўстае пытанне, хіба ўсё, што робіцца ў музеі, уваходзіць у абавязкі «захавальніка»? Думаю, што тут нешта не тое...

Карыстаючыся нагодаю, запрашаем да супрацоўніцтва педагогаў і школьнікаў, а таксама тых, каму цікавая нашая дзейнасць.

Роза МАРЧАНКА,
кіраўнік Музея гісторыі адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і гісторыі 12-й гімназіі

Слушны руплівец культуры

Уладзімір Аляксандравіч Гілеп нарадзіўся 11 сакавіка 1938 года ў вёсцы Острава Капыльскага раёна. Род ягоны – спрадвеку быў сялянскім. Працаваў на невялічкім кавалачку неўрадлівай зямлі. Вёсачка размясцілася сярод балотаў на малым па плошчы ўзвышшы – востраве, які сяды-тады быў пад вадою. Прозвішчы вяскоўцаў у яе большасці назваў адлюстраваў лёс землякоў – Галоцікі, Праташчыкі, Чэрнікі, Пешкуры, Буракі.



Партрэт дзядулі (малюнак Алёны Гілеп)

Пры сустрэчы ў 2008 годзе землякоў з Валодзем Гілепам (яны яго так называлі) былі ўсе як родныя. Бо іх былая вёска стала сумным відовішчам. Хаты стаяць з закалочанымі вокнамі, падворкі пустыя. Прыйшлі да роднай хаты Уладзіміра Аляксандравіча 5–7 аднавяскоўцаў. Ад радасці сустрэчы абняліся. Пабачыліся, пажурыліся. Жыццё прыпомнілі. Было няпроста. Працавалі ўсё жыццё змалку да глыбокай старасці. Заўсёды былі ўсе разам. Дбалі адно пра аднаго, дапамагалі кожны год бульбу капаць, загоны жаць, нават малаціць, ды і будавацца.

Даўней было да паўтары сотні людзей. Песні гучалі, вяселлі, хрэсьбіны спраўлялі на ўсю вёску. Пасля маладыя параз'язджаліся. Вёска апусцела. Вось як сталася. Усё гэта можна пачуць не толькі ў вёсцы Острава. Лёс становіцца незваротным, і калі «неперспектыўныя» вёскі застаюцца без школаў, бібліятэк, клубаў, крамаў, знікае і працяг гісторыі...

А вынікам – вучоба вяскоўца ў найстарэйшай школе Беларусі – сярэдняй школе № 1 (цяпер гімназія з беларускай мовай навучання) горада Слуцка. Споўніцца і мара У. Гілепа – стаць археолагам-гісторыкам і знайсці ў раскопе старажытнага Мінскага замчышча яшчэ аднаго археолага – жонку Рыму Віктараўну – трымальніцу сямейнага шчасця на працягу пяцідзесяці гадоў сямейнага жыцця. Разам і перачытаныя кнігі па гісторыі старажытных Афінаў, Рыма, Урарту, Ноўгарада з мясцовай бібліятэкі і жаданне атрымаць патрэбныя веды непасрэдна з першакрыніцы.

Вучань кінамеханіка ў Слуцку, шліфоўшчык на заводзе запасных частак у Мінску, служба ў Савецкай Арміі на тэрыторыі Арменіі – шляхі, якія ўрэшце скіравалі на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Шчаслівы лёс чалавека той, які ён сам будуе. Так сцвярджаў на пачатку сцежкі жыцця ўпэўнены ў сабе малады Уладзімір Гілеп. З першых дзён вучобы ўсё было накіраванае на здзяйсненне ягонай мары – пазавучэбная праца ў сектары археалогіі Акадэміі навук. Археалагічныя экспедыцыі па Беларусі, стварэнне ўніверсітэцкага археалагічнага музея і, нарэшце, як вынік – навуковая праца ў археалагічным аддзеле музея гісторыі і культуры Беларусі (цяпер Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь), які ствараўся тады. Навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар, намеснік дырэктара па навуковай частцы У. Гілеп быў сярод тых, хто стварыў першую поўнамаштабную экспазіцыю Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі ў 1967 годзе, дзе знайшла адлюстраванне і яго археалагічная праца пры раскопках старажытных курганоў у вёсцы Бердаж Чачэрскага раёна, Мінскага і Заслаўскага замчышчаў.

У сувязі з неабходнасцю перабудовы экспазіцыі самага вялікага музея краіны – Беларускага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – Міністэрства культуры БССР накіроўвае У. Гілепа на пасаду намесніка дырэктара гэтага музея па навуковай частцы.

На працягу пяці гадоў трэба было стварыць новую экспазіцыю музея, адкрыць для наведнікаў тры яго філіялы і сярод іх – мемарыяльны комплекс «Хатынь» і «Курган Славы». Гэта патрабавала велізарнай напружанай працы ўсяго калектыву музея, працы навуковай, арганізацыйнай, гаспадарчай.

У 1969 годзе ўрачыста адкрыты мемарыяльны комплекс «Хатынь», «Курган Славы», Музей славы ў пасёлку Обаль Шумілінскага раёна. 1974 год: урачыста адкрытая новая экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якая атрымала высокую адзнаку ад улады і наведнікаў. Да слова – гэтая экспазіцыя вось амаль ужо 40 гадоў працуе і нягледзячы на вялікі адрэзак часу лічыцца адной з лепшых экспазіцыяў музеяў пэўнага профілю ў былым СССР.

Затым была праца ў ЦК Кампартыі Беларусі, характар якой адпавядаў набытаму вопыту ў час вучобы і навуковай музейнай дзейнасці. Нягледзячы на застойны перыяд аддзел культуры ЦК КПБ ініцыяваў стварэнне ў краіне такіх музеяў, як Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Веткаўскі музей народнай творчасці, Заслаўскі і Раўбіцкі музеі і інш. Упершыню ў Беларусі быў пракладзены турыстычны маршрут па археалагічных, гістарычных і памятных мясцінах Беларусі.

На працягу 15 гадоў была праца на пасадзе намесніка Міністра культуры Рэспублікі Беларусь куратарам установаў культуры – музейнай, бібліятэчнай, клубнай і іншых накірункаў дзейнасці ў краіне як дапамога культасветустановам па захаванні народнай спадчыны беларусаў.

З ініцыятывы і пры непасрэдным удзеле У. Гілепа ствараюцца гісторыка-культурныя запаведнікі ў Полацку, Заслаўі, Нясвіжы. Вядзецца распрацоўка новага турыстычнага маршруту па гістарычных і памятных мясцінах Беларусі. На гэтым маршруце з'яўляюцца ўсё новыя, раней невядомыя, культурныя аб'екты. Сярод іх музеі С. Манюшкі ва Убелі Чэрвенскага раёна, А. Міцкевіча ў Завоссі Баранавіцкага раёна, В. Ваньковіча ў Мінску, М. Шагала ў Віцебску, народнай творчасці ў вёсцы Моталь Іванавіцкага раёна і іншыя.

На працягу першых гадоў існавання Нясвіжскага гісторыка-культурнага запаведніка У. Гілепу давялося сумяшчаць асноўную працу першага намесніка Міністра культуры з выкананнем на грамадскіх пачатках абавязкаў дырэктара запаведніка. Пры ім былі закладзеныя асноўныя накірункі дзейнасці запаведніка: распрацаваная канцэпцыя, статут, закладзеныя асновы плана рэгенерацыі старажытнага Нясвіжа, створаная «Нясвіжская Акадэмія» – двухгадовая летняя школа па падрыхтоўцы архітэктараў гістарычных ландшафтаў і Міжнародны фонд «Нясвіж». Гэта аказаўся грунтоўны падмурак, які дае і сёння надзею, што запаведнік будзе год ад года набіраць маштабнасць як помнік міжнароднага турызму.

У 1996 годзе Уладзімір Аляксандравіч пайшоў у адстаўку з пасады першага намесніка Міністра культуры, але застаўся працаваць на карысць нацыянальнай беларускай культуры. Ён быў абраны старшынёю Рады Беларускага фонду культуры (і цяпер фонд з'яўляецца грамадскім аб'яднаннем), разгарнуў шмат патрэбных арыгінальных праграмаў, якія не дублявалі накірункі дзейнасці дзяржаўных установаў. Некаторыя з іх цяпер зліліся ў адно цэлае. Напрыклад, «Вяртанне і захаванне нацыянальных культуных каштоўнасцяў», Рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры», праграмы падтрымкі народнага мастацтва на Беларусі: «Берагіня» – рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва, «Славутыя імёны Бацькаўшчыны», «Адраджэнне духоўнай культуры старажытных малых гарадоў і паселішчаў Беларусі».

Асаблівай значнасцю выдзяляюцца навуковыя праграмы «Вяртанне» (у рамках яе – серыя зборнікаў матэрыялаў і дакументаў «Вяртанне», выйшла 7 кніг), «Славутыя імёны Бацькаўшчыны» (выпушчаны 2-і том). Пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле ў якасці ўкладальніка У. Гілепа выйшлі юбілейныя выданні А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш» (на польскай, беларускай і рускай мовах), А. Пушкіна «Евгений Онегин» (на рускай і беларускай мовах), Якуба Коласа «Новая зямля» (на беларускай, рускай і ўпершыню польскай мовах), У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» (на беларускай, рускай, украінскай і англійскай мовах), М. Багдановіча «Раманс», «Слуцкія ткачыхі», «Пагоня» (на беларускай, балгарскай, англійскай, латышскай, літоўскай, нямецкай, польскай, рускай, украінскай, французскай мовах). Практычна ўсе гэтыя выданні былі адзначаныя высокімі ўзнагародамі на нацыянальных і міжнародных конкурсах.

Акрамя кіравання грамадскім аб'яднаннем «Беларускі фонд культуры» У. Гілеп выконвае шмат іншых грамадскіх абавязкаў: з'яўляецца старшынёю Беларускага камітэта міжнароднай Рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС), шматгадовым членам праўлення Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, членам Рэспубліканскага грамадскага Савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, праўлення Канфедэрацыі творчых саюзаў і культурных фондаў Беларусі. Ён удзельнічае ў працы іншых грамадскіх аб'яднанняў (старшыня журы Рэспубліканскага конкурсу мастакоў тэатраў на саісканне прэміі імя заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь І.М. Ушакова, член Камітэта па прэміях Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне культуры, заснавальнік «Нясвіжскай Акадэміі» – міжнароднай школы па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне рэстаўрацыі сядзібна-паркавай архітэктуры).

Усё не пералічыш. Няма ніводнага працоўнага дня, выхаднога і святочнага, каб у настольным нататніку не было запісаў на розныя мерапрыемствы. Запрашальнікі кладуцца на працоўны стол, а зранку і да абеду сыплюцца званкі па чатырох тэлефонах. Толькі паспявай і плануй, дзе трэба быць і прытым своечасова.

А «Краязнаўчая газета» мае штотыднёвы графік выхаду – чатыры разы ў месяц. Вось і круціцца колца працы ў старшыні БФК, ІКАМОСа і галоўнага рэдактара.

З дзядулем Пракопам (злева) і суседам. Родная вёска ўзімку 1945–1946 гг.

Таму юбілейны 2013 год праходзіць у штодзённай клопатнай працы на ўраджайнай дзялянцы, і сцежка жыцця завяла на шырокі гістарычны гасцінец, а само жыццё ўрасло ў шчырую праўдзівую і патрэбную дзейнасць дзеля шчаслівага лёсу, які выбраны ім самім для беларускай культуры, народа, краіны.

Георгій ТКАЦЭВІЧ

Спеўнік на розныя нагоды

У мінулам годзе свет пабачыў зборнік «Беларускія песні і гімны», укладальнікам і аўтарам артыкулаў якога стаў Сымон Барыс. Кніга выйшла ў выдавецтве А. Вараксіна накладам 300 асобнікаў. Пад адной вокладкай аўтар сабраў шматлікія творы, размеркаваўшы іх па групах: «Народныя гістарычны творы пра падзеі і асобы», «Літаратурныя творы на гістарычныя тэмы», «Рэкруцкія і салдацкія песні», «Казацкія песні», «Сацыяльна-бытавыя песні», «Песні беларускіх партызанаў», «Прыпеўкі і песні беларускіх калгаснікаў», «Турэмныя і разбойніцкія песні», «Песні воінаў-інтэрнацыяналістаў (афганцаў)». У зборнік увайшлі таксама як афіцыйныя, так і неафіцыйныя гімны, папулярныя песні. А ў трох змешчаных дадатках чытачы змогуць знайсці рускія песні, танцы, гімны славянскіх краінаў і ноты да некаторых песень.

Кніга выкананая ў каляровым афармленні, аздобленая фотаздымкамі розных народных калектываў Беларусі. Сустракаюцца і чорна-белыя фотаздымкі: ілюстрацыі да песень, фотапартрэты аўтараў вершаў, кампазітараў, выканаўцаў. Можна напаткаць і невялікія каментары да песень: кім выкананыя, дзе і кім запісаныя, дзе ўпершыню надрукаваныя і інш.

Маша МЕДЗВЯДЗЁВА

Дзе варта пабываць

«Белы замак», пачатак сезона 2013 года

Пастаянныя чытачы газеты добра ведаюць, што два разы на год непадалёк Мінска, у гісторыка-культурным цэнтры «Рыцарскі замак», праходзіць трохдзённае свята, дзе ажывае Сярэднявечча. Ажывае разам з мужнымі рыцарамі і гожымі паннамі, звонам мячоў і лязгам латаў, спевам цецівы лукаў і граннем старадаўніх інструментаў. Ажывае Сярэднявечча не толькі для сучасных рыцараў, але і для ўсіх, хто завітае ў рыцарскі замак каля Астрашыцкага Гарадка.

Гэтым разам фестываль сярэднявечнай культуры «Белы замак» запрашае ўсіх з 15 па 17 сакавіка. Арганізатары прапаноўваюць разнастайную праграму – будуць і двубоі мечнікаў, і паказ моды прамінулых стагоддзяў, і адзінаборствы алебардыстаў, і сучасныя інтэрпрэтацыі менестрэльскіх баладаў, і конны турнір, і прадстаўленні сярэднявечнага тэатра, які ўзнавілі нашыя сучаснікі ды суайчыннікі, і спаборніцтвы лучнікаў... Магістр «Ордэна Паўночнага Храма» месір Гадфруа дэ Манмірайль, клуба сярэднявечнай рэканструкцыі, якая цягам амаль дваццаці гадоў ладзіць фестываль, запрашае ўсіх аматараў сівой і гераічнай даўніны на свята і спадзяецца, што кожны новы «Белы замак» будзе больш цікавым за папярэднія (дарэчы, расповеды пра мінулагоднія імпрэзы можна знайсці на сайце БФК у раздзеле «Архіў»).

...Падталы вясновы снег, зыркае сонца – і ваяўнічыя выкрыкі, ляск зброі X–XVI стагоддзяў, іржанне коней... Гэта ўсё конны турнір і бугурт, што традыцыйна праходзіць з часоў першых фестываляў. І, сцвярджаюць некаторыя знаўцы-рыцары, акурат у сакавіцкім «Белым замку» жыве дух фестывалю ўзору канца XX стагоддзя, што раней праводзіўся ў Мінскім палацы дзяцей і моладзі. Ці так гэта, кожны вольны вырашаць для сябе. Адно ж без сумневаў: трое сакавіцкіх сутак (мерапрыемствы фестывалю будуць змяняць адно другое цягам гадзінаў, а ў суботу будуць доўжыцца болей за 12 гадзінаў) – гэта не толькі добрая магчымасць правесці выхадныя, але і наведаць, так бы мовіць, практычныя заняткі па гісторыі. Урокі з практычнымі заняткамі: наведнікам у перапынках даюць пастраляць з лукаў, пабіцца на мячах, проста прымерыць шалом ды даспехі, паглядзець на паходны побыт ліцвінскіх ды славянскіх віцязяў, тампліераў ды сарацынаў – на фэст збіраюцца рэканструктары розных краінаў Старога Свету, розных эпохаў. То сустрэнемся на «Белым замку»?

Уладзімір ПІРОГ

Царкоўнае краязнаўства

Храм Святога Архангела Міхаіла ў Ізабеліне

Згодна з гістарычным паданнем, першая прыходская царква ў мястэчку Ізабелін (сёння – Ваўкавыскі раён) была пабудаваная ў пачатку XVII стагоддзя. Захавалася кароткае апісанне будынка: *«Царква мураваная, у мураванай агароджы, па даўнасці існавання яе невядома, калі і кім пабудаваная»*.

У 1832 годзе настаяцелем Свята-Міхайлаўскай царквы ў Ізабеліне быў святар Іосіф Фаміч Восінскі. З 1851 года на прыходзе служыў Іаан Фаміч Зубковіч. Пасля яго настаяцелем быў Ігнацій Канчэўскі. У 1863-м на прыходзе служыў Стэфан Лявіцкі. Пры ім 18 красавіка ў царкве адбыўся пажар. У гэты дзень была навальніца, а 9-й гадзіне вечара маланка ўдарыла ў званіцу. Драўляная вежа згарэла, расплавіліся званы. Неўзабаве агонь ахапіў дах усяго царкоўнага будынка. Згарэла дахавае пакрыццё, кроквы, бэлькі і драўляны іканастас. Царкоўныя рэчы і іконы вынесеныя і выратаваныя дзякуючы самаахвярнасці мясцовага святара С. Лявіцкага і стараннасці жыхароў мястэчка Іосіфа Квачанюка, Пятра Салавіцкага і Людвіка Ляхманта.

Мураваныя сцены царквы хоць і захаваліся, але ў некаторых месцах ад агню патрэскаліся, а тынкоўка зусім абсыпалася. Царква аднаўлялася на працягу жніўня-кастрычніка. 8 лістапада (паводле старога стылю) 1863 года яе асвяцілі ў імя Святога Архангела Міхаіла ў прысутнасці прыкладна 4 000 чалавек.

Да гэтага дня царква ўпрыгожылася мясцовымі іконамі.

У 1889 годзе святаром у Ізабелінскай царкве быў прызначаны іерэй Фёдар Дружылоўскі. Пад яго кіраўніцтвам у прыходзе быў арганізаваны збор для будаўніцтва новага храма. У 1905 годзе пры святары Яўстафіі Міхайлаўскім у прыходзе ўжо налічвалася 2 693 прыхаджан, з іх 1 378 мужчынаў і 1 315 жанчынаў. Дзейнічалі тры царкоўна-прыходскія школы, у якіх было 112 вучняў, і 6 школаў пісьменнасці, дзе навучалася 76 чалавек. У царкоўным уладанні тады знаходзілася 36 дзесяцінаў зямлі.

Дакументальных сведчанняў аб жыцці прыхода ў гады Першай сусветнай вайны пакуль знайсці не ўдалося. Існуе толькі сведчанне прыхаджанаў, што ў гэты час з Заблудаўскага манастыра былі вывезеныя ў Слуцк мошчы святога дзіцяткі Гаўрыіла. На чацвёрты дзень пасля Троіцы, у сераду, хрэсны ход са святымі машчамі Гаўрыіла заставаліся ўсю ноч у Свята-Міхайлаўскай царкве. На наступны дзень хрэсны ход адправіўся далей. У памяць аб гэтай падзеі штогод у ізабелінскай царкве адбываецца святочнае богаслужэнне, прысвечанае святому дзіцятку Гаўрыілу Беластоцкаму, на якое прыязджаюць святары з Ваўкавыскага благачыння. У 1929 годзе рыма-каталіцкія духоўныя ўлады зрабілі спробу забраць царкву разам з сядзібай і 45 га зямлі праз суд. Справу выйгралі праваслаўныя ў 1931 годзе.

З 1934 па 1945 год настаяцелем храма быў святар Ілья Рэент. У гады службы айца Ільі прыход быў узнагароджаны «Благословенной грамотой», якая захоўваецца і сёння.

З красавіка 1945 па 1946 год настаяцелям царквы быў святар Лявонцій Гучок. Пасля яго – протаіерэй Барыс Ясінскі. З 25 лістапада 1946 года па 1954 год на пасаду прызначаны святар Барыс Прудзікаў. У 1955-м да прыхода быў прыкамандзіраваны святар Барыс Бачароў і служыў 6 месяцаў. З 1955 па 1968 год настаяцель – святар Мікалай Канстанцінавіч Усціновіч.

У 1970-я гады быў канфіскаваны і разбураны царкоўны драўляны будынак (з яго пабудавалі 2 кватэры), з царквы паздымалі званы.

З 21 верасня 1979 па 1 ліпеня 1990 года настаяцелем служыў Уладзімір Аляксеевіч Сцяцко. Ён нарадзіўся 16 лістапада 1931 года ў вёсцы Хвіневічы Дзятлаўскага раёна. Пасвечаны ў 1977 годзе мітрапалітам Філарэтам. Айцец Уладзімір прыклаў шмат намаганняў і ў 1982 годзе сумесна з клірам замяніў пашкоджаны чарапічны дах на нержавейку. У 1987 годзе адрамантавалі шатровы купал і пафарбавалі сцены.

У 1990 годзе для адраджэння прыхода прызначаны святар Фёдар Дмітрыевіч Шэлест.

З 10 жніўня 1991 па 2 ліпеня 1993 года на пасаду вярнуўся святар У. Сцяцко. У 1992 годзе айцец Уладзімір разам з прыхаджанамі намагаўся вярнуць царкоўны будынак. У 1982-м на фундаменце старога царкоўнага будынку калгас пабудаваў новы цагляны і вярнуў зямельны ўчастак у 0,46 га.

З 15 мая 1993 па 25 лютага 2000 года настаяцелем Свята-Міхайлаўскай царквы служыў святар Андрэй Алегавіч Барадулін. Пасвечаны 13 снежня 1992 года архіепіскапам Гродзенскім і Ваўкавыскім Валянцінам. Намаганнямі айца Андрэя ў царкве неаднаразова праводзіліся рамонтныя работы (апошні раз – у 1999 годзе).

Нейкі час у нашай царкве служылі Павел Вергун і Сергій Хвашчоў. Прыхаджане іх любілі за дабрыню, сумленнае жыццё і шчырае слова. Намаганнямі айца Паўла ў храме адрамантаваны столь, сцены, падлога. А з дапамогай айца Сергія праведзены газ.

З 2009 па 8 жніўня 2012 года настаяцелем храма Святога Архангела Міхаіла быў Яўген Сяргеевіч Красоўскі. З 8 жніўня 2012 года служыць іерэй Сяргей Пясняк.

Неабходна адзначыць, што Свята-Міхайлаўская царква ніколі не закрывалася: ні ў гады войнаў і ліхалецця, ні ў час нямецкай акупацыі, ні пры хрушчоўскіх ганеннях. Яна выконвала не толькі хрысціянскае служэнне, але і вялікую асветніцкую місію, дзякуючы якой сялянскія дзеці навакольных вёсак упершыню ў гісторыі гэтага краю навучыліся чытаць і пісаць, і перад імі адчынілася вакно ў Свет. А іх унукі, хрышчоныя ў гэтай царкве, сталі настаўнікамі, дактарамі, інжынерамі, афіцэрамі, грамадскімі і дзяржаўнымі дзеячамі.

Гісторыя і час змянілі жыццё сельскіх жыхароў. З кожным годам іх колькасць змяншаецца. Сёння прыхаджанаў царквы (хто ў стане прыйсці) засталося няшмат. Добра, што часта ў сваю царкву прыходзяць і тыя, хто не жыве тут, але чые карані з гэтай зямлі, бо тут магілы іх продкаў.

У шматзначнай задуменнасці цягне ў высокі блакіт неба свой купал велічны храм Святога Архангела Міхаіла. Ён вабіць вернікаў, вабіць любога высокадухоўнага чалавека, спрыяе далучэнню да тайны Богаспазнання.

Але стан помніка штогод пагаршаецца. Высокая вільготнасць і перапады тэмпературы разбураюць цэглу. Помніку патрабуецца рэстаўрацыя. Таму закончу артыкул зваротам па дапамогу да тых, хто жадае ўнесці свой уклад у рэстаўрацыю і захаванне гэтага непаўторнага цуда. Мы звяртаемся да прадпрыемстваў, арганізацыяў, а таксама да тых прыхаджанаў, чые карані выходзяць з ізабелінскай зямлі. Малітва аб ахвяравальніках і добраўпарадкавацелях будзе заўсёды ўзносіцца ў сценах храма Божага. **Дабрачынныя ахвяраванні можна пераводзіць на рахунак:**

прыход храма Святога Архангела Міхаіла ў вёсцы Ізабелін, вул. Ваўкавыская, 38,

р/р 3015203840017, код банка 152101446,

аддзяленне ААТ «Белагрупрамбанк» у г. Ваўкавыску,

УНП 500066425.

Ганна СВІСТУН, бібліятэкар Ізабелінскай сельскай бібліятэкі

Гістарычная сустрэча

19 лютага ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася літаратурная сустрэча «Кожны крыж свой выбірае», якая прайшла ў рамках музейнага праекта «Нашчадкі славутых людзей». Гэтым разам у гасцінны Дом Коласа запрасілі сям'ю Радзіма Гарэцкага, вядомага нашчадка знакамітага роду.

Імёны братоў Максіма і Гаўрылы Гарэцкіх, вядомыя і дарагія сэрцу кожнага свядомага беларуса. Гэта тыя людзі, якія нягледзячы на жорсткасць камуністычнага рэжыму спрабавалі прабіць шлях да сапраўднай Беларусі.

Максім Гарэцкі – класік беларускай літаратуры, яго імя стаіць у адным шэрагу са славутымі і знакавымі імёнамі першае паловы XX стагоддзя Янкам Купалам, Якубам Коласам, Максімам Багдановічам і інш. Творчасць пісьменніка, жыццё якога заўчасна абарвала рэпрэсіўная сталінская сістэма, доўгі час была пад забаронаю. Але высока ацэненая сучаснікамі. Нельга перабольшыць уклад М. Гарэцкага у станаўленне і развіццё беларускага прыгожага пісьменства. Фактычна ён – пачынальнік твораў маральна-этычнай праблематыкі ў беларускай літаратуры, адзін з пачынальнікаў эпічнага жанру, інтэлектуальна-філасофскай, лірычнай, дакументальнай прозы, пачынальнік даследаванняў гісторыі беларускай літаратуры.

М. Міцкевіч і Р. Гарэцкі

Гаўрыла Гарэцкі – вядомы беларускі геолаг, географ, акадэмік і вучоны, таксама быў высланы з роднай Беларусі і спазнаў цяжкасці выгнання. Данінай памяці братам Гарэцкім, дзядзьку Максіму і бацьку Гаўрылу, стала кніга Р. Гарэцкага «Браты Гарэцкія» (2008). На старонках выдання праз лёс адной сям'і прасочваецца лёс шматпакутнае Беларусі.

З абодвума братамі Гарэцкімі Якуба Коласа лучылі не толькі працоўныя і творчыя, але і шчырыя сяброўскія стасункі. Сябравалі сем'ямі. Іх збліжалі і настаўніцкія клопаты, і пісьменніцкія прыхільнасці, бо Максімава жонка, Леаніла Усцінаўна, таксама была не толькі педагогам, складальніцай школьных падручнікаў, але і вядомай у свой час дзіцячай пісьменніцай.

У юбілейнай сустрэчы прынялі ўдзел Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі і яго жонка Галіна Рыгораўна, Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч, доктар тэхнічных навук, прафесар, сын Якуба Коласа, якія па чарзе бралі словы. Яны ўспаміналі, абменьваліся меркаваннямі, зачытвалі лісты бацькоў. А каб імпрэза не была аднастайнай, настрой гасцям стваралі навучэнцы Гімназіі-каледжа імя І. Ахрэмчыка музычнымі выступамі. Пад час урачыстай сустрэчы ў выставачнай зале музея можна было пазнаёміцца з экспанатамі юбілейнай выстаўкі «Сябры майго далёкага юнацтва», дзе да ўвагі наведнікаў былі прадстаўленыя арыгіналы лістоў Якуба Коласа і Марыі Дзмітрыеўны да Леаніды Чарняўскай, да Гаўрылы Іванавіча і Ларысы Іосіфаўны Гарэцкіх, рукапіс успамінаў Галіны Максімаўны, дачкі Максіма, пра бацьку і роднага дзядзьку, выданні твораў М. Гарэцкага 1920-х гадоў, сямейныя фотаздымкі з дарчымі надпісамі.

Наста КАДЫГРЫБ,
фота аўтара

Філалагічнае краязнаўства Гродзеншчыны

Напрыканцы 2012 года з'явіўся зборнік навуковых артыкулаў, падрыхтаваны кафедрай беларускага і тэарэтычнага мовазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы «Філалагічнае краязнаўства Гродзеншчыны (матэрыялы і даследаванні)». Яго выпусціла гродзенскае выдавецтва «ЮрСаПринт». Ініцыятарам, арганізатарам і адказным рэдактарам зборніка з'яўляецца загадчык кафедры доктар філалагічных навук прафесар Мікалай Даніловіч, які ўжо больш за трыццаць гадоў займаецца даследаваннем мовы і фальклору Гродзенскага рэгіёну. На рахунку Мікалая Аляксандравіча кнігі «Слоўнік рэгіянальнай лексікі Гродзеншчыны» (1999), «Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны» (2000), «Беларускае вяселле: на матэрыяле Гродзеншчыны» (2000), «Дыялектная мова Гродзеншчыны: хрэстаматыя» (2007), «Лінгвістычная краязнаўства Гродзеншчыны: дапаможнік» (2008).

Аўтарамі артыкулаў новага зборніка з'яўляюцца выкладчыкі, аспіранты, студэнты ўніверсітэта, настаўнікі і краязнаўцы Гродна і вобласці.

Зборнік выдадзены з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Максіма Танка. Ягоны лёс быў цесна звязаны з Гродзеншчынай. У Заходняй Беларусі Максім Танк быў у цэнтры беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і літаратурнага жыцця. І ў пасляваенны час ён падтрымліваў цесную сувязь з Гродзеншчынай як пісьменнік і як грамадскі дзеяч.

Артыкулы ў зборніку размяркоўваюцца па чатырох раздзелах, што адлюстроўваюць розныя віды краязнаўства.

Першы – «Літаратурнае краязнаўства» – пачынаецца артыкулам знанага краязнаўца С. Чыгрына «Максім Танк на старонках "Беларускага летапісу"». У ім аналізуецца творчая спадчына паэта, апублікаваная ў згаданым часопісе, што выдаваўся ў Вільні і ў рэдакцыі якога з 1937 года Максім Танк працаваў. Пісьменніца А. Руцкая дзеліцца ўспамінамі пра пяць незабыўных сустрэчаў з Максімам Танкам, калі яна вучылася ў БДУ. Былы сакратар Ашмянскага райкама партыі, а цяпер вядомы гродзенскі краязнавец І. Сухоцкі апавядае пра грамадскую дзейнасць Максіма Танка, які ў 1970-я гады двойчы выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР па Ашмянскай выбарчай акрузе. У першым раздзеле змешчаныя таксама артыкулы пра пісьменнікаў Гродзеншчыны Элізу Ажэшку, Аляксея Карпюка, Максіма Багдановіча, Лейба Найдуса.

Самы вялікі другі раздзел –«Лінгвістычнае краязнаўства». Ён складаецца з індывідуальных слоўнічкаў, у якіх падаецца лексіка, фразеалогія, тапанімія, антрапанімія



Зборнік навуковых артыкулаў (да 100-годдзя з дня нараджэнняМаксіма Танка)

асобных вёсак і куткоў Гродзеншчыны. Кожны слоўнічак – гэта падборка дыялектных словаў, фразеалагізмаў, мікратапонімаў, імёнаў, прозвішчаў ці мянушак, запісаных аўтарамі ў той або іншай вёсцы (звычайна роднай) ці на тэрыторыі сельсавета.

Найбольшая колькасць слоўнічкаў, што адлюстроўваюць багацце рэгіянальнай мікратапаніміі. Збіранне і лексікаграфічнае спарадкаванне гэтай спецыфічнай лексікі сёння асабліва надзённыя, бо ў выніку сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў адбываецца разбурэнне традыцыйнай беларускай вёскі і разам з гэтым незваротна страчваецца, адыходзіць у нябыт рэгіянальная мікратапанімія, якая складвалася на працягу стагоддзяў.

Кожнаму мікратапоніму ў падборцы прысвечаны асобны слоўнікавы артыкул, складнікамі якога з'яўляюцца: загалоўкавае слова, граматычныя паметы, тапанімічны аб'ект, ілюстрацыйныя прыклады, геграфічныя арыенціры размяшчэння аб'екта, пашпартызацыя запісу. Цікавымі ў артыкулах з'яўляюцца этымалагічна-гістарычныя звесткі пра ўтварэнне мікратапонімаў, асабліва тых, што ўзніклі на аснове састарэлых словаў, якія сёння семантычна зацемненыя, незразумелыя, напрыклад: *Куліса* 'частка ўрочышча' – назва хутчэй балцкага паходжання, параўн. літоўскае *kulis* 'малы паўвостраў' (с. 86); *Задубішча* 'урочышча – паласа сушы шырынёй прыкладна 1 км і даўжынёй 6 км паміж Святым Балотам і Альсом, што пачынаецца за 1 км ад вёскі Бабіна і цягнецца ў паўднёва-ўсходнім напрамку да вёскі Дубінка' – у «"Ардынацыі каралеўскіх пушчаў" 1641 года значыцца як Дубішча» (с. 84).

Трэці раздзел «Фальклорнае краязнаўства» складзены з артыкулаў пра малыя формы фальклору – легенды і паданні, якія тлумачаць паходжанне назваў населеных пунктаў і іншых тапанімічных аб'ектаў. Напрыклад, М. Якалцэвіч прапануе цікавую падборку прыказак з гаворкі роднай вёскі Дуляўшчына Мастоўскага раёна (дарэчы, прыказкі ў парэміялагічных працах не апісваліся): *Каго Бог любіць, таму крыжы дае* – 'Кажуць пра таго, хто пакутуе, у каго няшчасці ідуць адно за адным'; *Няма тых грабель, каб граблі ад сябе* – 'Гаворыцца пра тых, хто ўсё робіць на сваю карысць'; *Твая мама ласа, з'ела яблычка да Спаса* – 'Да Спаса (свята ў праваслаўных, якое прыпадае на 19 жніўня паводле новага стылю) нельга есці яблыкаў'; *Што не ў модзе, кладзі на сподзе* – 'Нямоднае адзенне не трэба выкідваць, бо праз нейкі час яно можа стаць патрэбным, модным'; і інш.

М. Даніловіч і Н. Памецька падаюць падборку дражнілак, сабраную імі на Гродзеншчыне за апошнія дваццаць гадоў. Размяшчаюцца дражнілкі паводле алфавіта асабовых імёнаў. Вось некаторыя цікавыя прыклады:

Андрэй. Андрэй-верабей на кадушцы сядзеў, усіх жаб пераеў, адну не даеў, і жывот забалеў (Нізаўцы Навагр.).

Ванька. А чаму ш ты, Ванька, без валос застаўся? А таму што рана з дзеўкамі звязаўся (Ашмяны).

Віця. Віця, Віця, тра-ля-ля. Прадай карову, купі цяля (Нягневічы Навагр.).

Іван. Іван-барабан на капусьці сядзеў, Іван-барабан усе чэрві паеў (Кульбакі Лід.).

Лена. Лена – палена, сьвіне па калена, а як стала на мосьцік, стала сьвіне па хвосьцік (Студзянец Ваўк.).

Маруся. Як Марусі на работу – Маруся ні хоча. Як Марусю за капоту – Маруся рагоча (Бародзічы Зэльв.).

Ніна. Наша Ніна ганарова, паехала ў лес па дрова, зачапіласа за пень, прастаяла цэлы дзень (Бабіна Гродз.).

Сярожа. Божа мой, Божа! Памёр мой Сярожа. Учора гараў, а дзісь ногі задраў (Кульбакі Лід.).

Янак. Янак пабіў збанак, сядзіць на ганку і плачыць па збанку (Косцевічы Астр.).

Чацвёрты раздзел «Лінгвакультуралагічнае краязнаўства» пачынаецца праграмным артыкулам вядомага пісьменніка-літаратуразнаўца прафесара А. Пяткевіча «Традыцыйная народная культура як актуальны прадмет краязнаўства», у якім сцвярджаецца, што народная культура беларусаў, аздобленая рэгіянальнымі адметнасцямі, – унікальная з'ява, удзячнае поле для краязнаўчых пошукаў, знаходак, адкрыццяў, на якім трэба шчыраваць дый шчыраваць, пакуль яшчэ не позна. У гэтым раздзеле прапануецца распрацоўка турыстычнага маршруту «Шляхамі Карскага ў Прынямонні». Аўтары распрацоўкі краязнаўцы А. Крой і І. Буднік прапануюць турыстычнае падарожжа па мясцінах (Гродзенскі, Бераставіцкі і Мастоўскі раёны), дзе жыў, вучыўся, працаваў і адпачываў славуты зямляк доктар філалогіі, першы беларускі акадэмік Яўхім Фёдаравіч Карскі.

Зборнік навуковых артыкулаў «Філалагічнае краязнаўства Гродзеншчыны» разлічаны на мовазнаўцаў, літаратуразнаўцаў, фалькларыстаў, этнографаў, гісторыкаў, культуролагаў, студэнтаў, настаўнікаў, школьнікаў – усіх, хто цікавіцца родным словам, духоўнай спадчынай краю.

Васіль РАГАЎЦОЎ

Краязнаўства ў эпісталярным жанры

Сяргей Новік-Пяюн:

«Маю напісанага шмат матэрыялу...»

Біяграфія заходнебеларускага паэта Сяргея Міхайлавіча Новіка-Пеюна (1906–1994) сёння добра вядомая. Артыкулы пра аўтара некалі папулярнай песні «Зорачка» (пасля Вялікай Айчыннай вайны Рыгор Шырма апублікаваў яе як народную) змешчаныя ў энцыклапедыях і энцыклапедычных слоўніках Беларусі. Шмат значыў ужо сам факт уключэння біяграфіі «беларускага савецкага паэта» ў «ЭЛІМБел» у 1987 годзе: тады персаналія ўмясцілася ў 14 радкоў, дзе ні слова пра шматгадовыя лагерныя, астрожныя пакуты Сяргея Міхайлавіча. У іншых тэкстах ужо праўдзівы жыццяпіс...

Асабіста я «адкрыў» паэта С.Новіка-Пеюна па кнізе «Заўсёды з песняй» (Мінск, 1984). Пра яе і напісаў невялікую рэцэнзію і надрукаваў у шматтыражцы Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча «Политработник» ад 27 кастрычніка 1984 года. Матэрыял прайшоў у друк без усялякіх праблемаў. Пісаў жа пра кнігу вязня Калдычэўскага фашысцкага канцлагера, пра вершы, якія беларускі паэт стварыў у гітлераўскім палоне. А тое, што Сяргей Міхайлавіч быў яшчэ вязнем і ГУЛАГа, у Львове і ведаць ніхто не ведаў. Як не ведаў, дарэчы, і я...

Праз некаторы час знайшоў адрас аўтара кнігі, адправіў паэту ліст і газету з публікацыяй. Сяргей Міхайлавіч напісаў мне ў адказ: *«Добры дзень глыбокапаважаны Аляксандр Мікалаевіч! Ад усяго сэрца дзякую Вам за ліст ад 16.04.1985 года і газету "Политработник" № 28 (1117) за 27.X.1984 года з Вашай рэцэнзіяй на маю кнігу "Заўсёды з песняй" П.Н. "Беспрецедентная лирика".*

Мне цікава ведаць: ці Вы заўважылі маю кнігу ў Львоўскай кнігарні? Бо ў кнігарнях Мінска яе не было, далі толькі ў абласныя і раённыя кнігарні БССР...»

Не, кнігу я набыў у Беларусі. Хутчэй за ўсё – у Мар'інай Горцы. Набыў тады і новы зборнік вершаў Рыгора Барадуліна на рускай мове – «Каждый четвёртый».

...Чытаю з ліста Сяргея Міхайлавіча і як быццам вяртаюся ў Львоў, узгадваю тую «львоўскую» зацікаўленасць родным беларускім словам. *«Пішу я ад 1921 года, друкуюся з 1926 года. Аб маім жыццяпісу Вы часткова ведаеце з прадмовы да кнігі Алега Лойкі – майго "падшэфнага" юнага паэта, які быў вучнем 3-га класа, калі ягоная маці прывяла ўпершыню да мяне. Алег называе мяне сваім "першым настаўнікам на літаратурнай сцежцы". Пра ўсё Алег не напісаў, бо на гэта спатрэбілася б шмат часу і... паперы.*

Вас цікавіць, як пісалася ўсё сабранае ў кніжку. Мушу Вас папярэдзіць, што кніга мая была задуманая паэтамі Уладзімірам Паўлавым і Алегам Лойкам не гэткай брашуркай, а зусім іншай. Для кнігі я даў 111 вершаў, 21 песню – тэксты і ноты (мае), 21 фотакопію маіх карцін (чорна-белыя і каляровыя), п'есу "Ёлка Дзеда Мароза", 2 апавяданні – "Андрэйка" і "Цішка". (Прыкладаю да гэтага ліста выпіску з тэматычнага плана выдавецтва "Мастацкая літаратура" 1984 года, з чаго Вы даведаецеся, што кніга мелася быць на 6 аркушах, а не на 1,5, і ў цвёрдай вокладцы.) Найбольш цікавыя мае вершы не былі ўключаны ў кнігу. Бачыце, якую брашуру зрабілі...»

С. Новік-Пяюн у сваёй аднапакаёўцы

Забягаючы наперад, нагадаю, што ў Сяргея Міхайлавіча была выдадзеная яшчэ адна кніга «дарослай» паэзіі – «Песні з-за кратаў» у 1993 годзе ў «Мастацкай літаратуры». У гэты зборнік увайшло 78 твораў – вершы, песні, паэма «Цярністы шлях».

«...Вас цікавіць пытанне: "Як, як пісалася ўсё сабранае ў кнігу?"– піша далей Сяргей Міхайлавіч. – Мушу Вам паведаміць, што стваралася і "запісвалася" ў памяці, бо ў астрозе, у адзіночцы, у лагеры смерці Калдычэва я не меў ні паперы, ні алавіка. Усё ствараў "у галаве" і "запісваў" у памяці. І толькі пасля вызвалення мяне падчас расстрэлу савецкімі партызанамі я ўсё створанае ў няволі запісваў на паперы. Усе свае вершы і песні, пачынаючы ад 1921 года, я ведаю напамяць. Маю рукапісную кнігу сваіх песень – тэксты і музыку. Чакаючы выканання прысуду гітлераўцаў – расстрэлу, у адзіночцы з 14 па 25 мая 1944 года (з серады на чацвер), я стварыў і "запісаў" у памяці 4 (чатыры) песні: 1) "Мама, матуля мая" – 44 (сорак чатыры куплеты), 2) Раманс "Белы снег" – 5 (пяць) куплетаў, 3) "Краскі" – 3 куплеты, 4) "Я так цябе люблю" – 3 куплеты. Гэта за адну ноч. Шчыра прызнаюся: я і сам не ведаю, як гэта ўсё "трымаецца" ў маёй памяці. Можа, таму, што я ніколі не падаў духам. Нават у лагеры смерці да мяне звярталіся сябры нядолі на розных мовах: "Што рабіць?" – Я адказваў: "Што рабіць не ведаю, але ведаю, чаго не рабіць! Не быць баранамі! Павядуць на расстрэл, бегчы, ану куля-дура міне!" І ўсе, хто мяне слухаў, пабеглі і выратаваліся, толькі я сам быў паранены. Дзякуючы партызанам быў выратаваны.

Чытаючы ў Вашай рэцэнзіі радкі: "... в 1944 году из-под пера выходит "Острожная песня"..." Зараз Вы ведаеце, што ніякага "пера" я не меў. Маю напісанага шмат матэрыялу, мабыць кніг на 20 (дваццаць), але дачакацца іх надрукавання вельмі цяжка. У выдавецтве "Юнацтва" рыхтуецца мая кніга "Зорачкі ясныя", якая запланавана на 1986 год. Здаў у тое ж выдавецтва трэцюю кнігу. 27 жніўня 1986 года мне споўніцца 80 гадоў з дня нараджэння. Я пенсіянер, маю 72 рублі пенсіі. Толькі 4 снежня 1984 года мяне прынялі ў Саюз пісьменнікаў БССР. 22 красавіка 1985 года мне ўручылі членскі білет Саюза пісьменнікаў СССР.

Я быў вельмі рады сустрэцца з Вамі і асабіста мог бы Вам расказаць аб сабе. Маё жыццё вельмі складанае, нават Жуль Верн не прыдумаў бы нешта падобнае. Паўтараю: А. Лойка ў прадмове да маёй кнігі шмат чаго не дагаварыў аб маім жыцці...».

Тады – і калі пісаў пра кнігу, і калі чытаў ліст – я нічога не ведаў пра біяграфію С. Новіка-Пеюна «па-за межамі» Вялікай Айчыннай. Ці ведаў надзвычай мала ў звязку 1920-мі гадамі. Ды і Сяргей Міхайлавіч не спяшаўся расказваць. Ужо пазней, з наступных лістоў, а пасля і пры першай сустрэчы ў ліпені 1985 года сёе-тое стала мне зразумелым. Хаця і ўявіць гэта таксама спярша было не так проста. І пра высылку ў 1926–1931-х, наступны арышт па вяртанні і высылку ў Слонім. А быў жа арышт і ў 1939-м, перад самым вызваленнем Заходняй Беларусі. І тым больш – пра арышт у снежні 1944 года, калі, здавалася, увесь цяжар выпрабаванняў павінен застацца ззаду. Ды не, так толькі здавалася. А ў Новіка-Пеюна за арыштам – яшчэ 14 лагерных гадоў на Калыме. Рэабілітацыя прыйшла толькі ў 1958-м...

Былы вязень некалькіх рэжымаў

З ліста паэта: *«Я Вам шчыра ўдзячны, дарагі Алесь Мікалаевіч, за Вашу рэцэнзію, тым больш, што ні "Полымя", ні "Маладосць", ні "Літаратура і мастацтва" не адгукнуліся...*

Пасылаю да Вас часопіс "Беларусь" №4 за красавік 1985 года, у якім змешчаны мой нарыс аб гісторыі песні "Што за хлопец, што за дзяўчынка?"

Яшчэ хачу Вам сказаць, што жыву я адзін, бо мая сям'я знішчана гітлераўцамі ў лагеры смерці Калдычэва.

А ў парадку "смяшынак" напішу: піянеры-цімураўцы 60-е школы горада Мінска на маіх дзвярах намалявалі чырвоную зорку і больш я іх не бачыў... Адным словам – "узялі шэфства нада мной".

...Даруйце, калі ласка, за "друкарскую памылку". Зычу Вам добрага здароўя і ўсяго найлепшага.

З сардэчным прывітаннем, глыбокай пашанай і ўдзячнасцю

Сяргей Новік-Пяюн».

«Заўсёды з песняй» – не проста зборнік. Пры ўсіх момантах, якія і акрэсліў у лісце Сяргей Міхайлавіч, кніга і для яго была падзеяй. А як жа інакш?! Уявіце сабе, што папярэдняя яго кніга выйшла ў 1939 годзе – п'еса «Праўда пад крыжам» (Вільня). Яшчэ тры п'есы выйшлі асобнымі выданнямі ў 1927 годзе. Таму і важныя былі для Новіка-Пеюна водгукі чытачоў, крытыкі. Максім Танк, атрымаўшы ад аўтара «Зорачак» апошнюю яго кнігу – «Песні з-за кратаў», пісаў Сяргею Міхайлавічу 12 верасня 1993 года: *«...Вершы напісаны шчыра і проста, без ніякіх модных выкрутасаў. І ў гэтым – іх грамадская і мастацкая вартасць. Яны не выветрываюцца, як пух, з памяці, і да іх мы часта вяртаемся ў трывожныя хвіліны жыцця, можа, таму, каб сказаць сабе: "Бачыш, праз якое пекла прайшлі наш народ і яго паэт і – не здаліся..."».* Шмат хто ўсё ж адгукнуўся і на кнігу «Заўсёды з песняй»: лістамі, паштоўкамі, тэлефоннымі званкамі, самымі добрымі словамі...



Сяргей Новік-Пяюн

ЗАЎСЁДЫ З ПЕСНЯЙ

ПАЭМА, ВЕРШЫ, ПЕСНІ, ТВОРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Глыбокапаважанаму Паэту Сяргею Сцяпанавічу Панізніку з найлепшымі пажаданнямі і глыбокай пашанай на шчыры ўспамін —

Сяргей Новік-Пяюн. —

Сяргей Міхайлавіч НОВІК-ПЯЮН г. Мінск

г. Мінск, 10-5-1984 г.

Мінск «Мастацкая літаратура» 1984

Архіў С. Новіка-Пеюна знаходзіцца ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. Магчыма, прыйдзе час, і з яго дапамогай якое з выдавецтваў выпусціць у свет грунтоўны том спадчыны Маладога Дзядка (адзін з псеўданімаў заходнебеларускага паэта). Відаць, і эпісталярная спадчына зойме ў ім адпаведнае месца.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Фота Сяргея ПАНІЗЬНІКА

Сакавік

13 – Качаноўскі Уладзімір Васільевіч (1853, Драгічынскі р-н – 1901), вучоны-славіст, гісторык – 160 гадоў з дня нараджэння.

15 – Ляцкі Яўген Аляксандравіч (1868, Мінск – 1942), гісторык рускай літаратуры, даследчык беларускага фальклору і этнаграфіі – 145 гадоў з дня нараджэння.

15 – Малажай Галіна Мікалаеўна (1938, Брэсцкі р-н – 2005), мовазнаўца, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі адукацыі Беларусі – 75 гадоў з дня нараджэння.

16 – Івацэвіцкі гісторыка-краязнаўчы музей (1993) – 20 гадоў з часу адкрыцця.

17 – Ізя Харык (Ісак Давыдавіч; 1898, Барысаўскі р-н – 1937), яўрэйскі паэт, член-карэспандэнт НАН Беларусі – 115 гадоў з дня нараджэння.

18 – Паўлюк Прануза (Павел Кузьміч; 1918, Добрушскі р-н – 2007), паэт – 95 гадоў з дня нараджэння.

18 – Яновіч Алена Іванаўна (1933, Гомель), мовазнаўца – 80 гадоў з дня нараджэння.

19 (ці 25) **– Храптовіч Адам** (1768, Навагрудскі пав. – 1844), асветнік, мецэнат, дзяржаўны дзеяч, удзельнік паўстання 1794 г. – 245 гадоў з дня нараджэння.

20 – Бутрамееў Уладзімір Пятровіч (1953, Дрыбінскі р-н), пісьменнік, драматург – 60 гадоў з дня нараджэння.

24 – Гомельская абласная ўніверсальная бібліятэка імя У.І. Леніна (1928) – 85 гадоў з часу заснавання.

25 – Мехаў Уладзімір Львовіч (Няхамкін; 1928, Рагачоў), пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986) – 85 гадоў з дня нараджэння.

28 – Пастаяннае прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь пры ААН (1958), замежны дыпламатычны орган знешніх зносінаў беларускай дзяржавы, які прадстаўляе інтарэсы Рэспублікі Беларусь у ААН – 55 гадоў з часу ўтварэння.

Жарт тыдня ад Каласка і Калінкі

– Люба, зрабі са мною тое, што ты зрабіла з нашым сабакам.

– Што?

– Дай, калінка, паесці і пусці пагуляць.

У тэатры «Зьніч»

19 сакавіка маленькіх гледачоў запросяць пакружыцца на **«Вясёлай каруселі»**. Выканаўца – заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ларыса Горцава, музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай (цымбалы).

Увечары на сцэне паэтычны монаспектакль **«Прыпадаю да нябёс»** паводле твораў Яўгеніі Янішчыц. Выканаўца – заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Ларыса Горцава, музычнае суправаджэнне Дар'і Неўмяржыцкай (цымбалы).

20 сакавіка ўвазе дзяцей прапануюць монаспектакль **«Мой Маленькі прынц»** паводле аповесці Антуана дэ Сэнт-Экзюперы і вершаў П'ера Беранжэ ў перакладзе Ніны Мацяш. Выканаўца – Раіса Астрадзінава.

Увечары – паэтычны монаспектакль **«Любіць»** паводле твораў Алеся Вярцінскага. Аўтар інсцэніроўкі і выканаўца – Галіна Дзягілева, музычнае суправаджэнне Кірылы Успенскага (гітара).

21 сакавіка на сцэне Малой залы імя Р. Шырмы Белдзяржфілармоніі паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч Навум Гальпяровіч прадставіць паэтычна-музычную імпрэзу **«Я ад дрэва твайго»**. Пачатак а 19-й.

Спектаклі праходзяць у Тэатральнай зале культурнага цэнтра касцёла Св. Сымона і Св. Алены. Дзіцячыя пастаноўкі пачынаюцца а 15 гадзіне, вечаровыя – а 19-й. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па мінскім тэлефоне (017) 331-75-53.

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

МІНСК – сталіца Рэспублікі Беларусь, горад рэспубліканскага падпарадкавання, цэнтр Мінскіх раёна і вобласці. Палітычны, адміністрацыйны, эканамічны, навуковы і культурны цэнтр дзяржавы, горад-герой (26.06.1974). На р. Свіслач, прытоку Бярэзіны.

Летапісны Менск (Меньск) упершыню ўпамінаецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 1067 г. як горад Полацкага княства. Старажытны цэнтр горада – дзядзінец узнік на правым беразе р. Свіслач, пры ўпадзенні ў яе р. Няміга, дзе ў 2-й палове XI ст. з мэтай абароны паўднёвых межаў Полацкага княства пабудаваны Менскі замак. Гэта была крэпасць (плошча 3 га), акружаная ровам і высокім земляным валам, з драўлянымі крапаснымі сценамі.

На думку некаторых гісторыкаў, старажытны Менск узнік за 16 км на захад ад тэрыторыі мінскага замчышча, на беразе р. Менка (адсюль і назва), дзе (каля в. Гарадзішча Мінскага раёна) захаваліся земляныя валы, пры раскопках знойдзеныя прылады працы, кераміка, упрыгожанні; у 3-й чвэрці XI ст. Менск перанесены на сучаснае месца. Канчаткова гэтае пытанне не высветленае.

У пачатку XII ст. на замчышчы пачалі будаваць мураваны храм. У XII–XIII стст. на поўдзень, паўднёвы захад, паўднёвы ўсход ад замчышча вырас рамесны пасад з гандлёвай плошчай – Нямігскі рынак (з X ст. Ніжні рынак), вуліцы якога, вымашчаныя драўляным насцілам з дрэнажнымі прыстасаваннямі, шчыльна забудоўваліся зрубнымі дамамі. Цэнтральная вуліца пасада Няміга (самая старажытная вуліца, XII ст.) ішла ўздоўж р. Няміга, з паўночнага захаду падыходзіла да Нямігскага рынку і далей да моста праз р. Свіслач. У гэты час узніклі пасады на левым беразе Свіслачы каля Траецкай гары і на паўночны захад ад замчышча Пятніцкі канец (з XVI ст. Татарскі канец).

У канцы XI – пачатку XII ст. горад стаў цэнтрам удзельнага Менскага княства (першы князь Глеб Усяславіч). У 1116 г. вытрымаў амаль 2-месячную асаду дружыны вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Манамаха, які ў 1119 г. захапіў горад і далучыў яго да сваіх уладанняў. З сярэдзіны XII ст. – зноў цэнтр удзельнага княства, адзін з буйных гарадоў Полацкай зямлі. З канца XIII ст. Менскае княства было пад уплывам князёў-ліцвінаў, у 1-й чвэрці XIV ст. увайшло ў Вялікае Княства Літоўскае. У 1499 г. горад атрымаў магдэбургскае права. Пацвярджальным прывілеем на магдэбургскае права ад 12.01.1591 г. гораду нададзены герб: выява Дзевы Марыі на блакітным полі. Пасля 1413 г. – у складзе Віленскага ваяводства. У выніку адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1564–1566 гг. стаў цэнтрам Менскага ваяводства і павета.

У XV ст. у асноўным сфармавалася забудова Траецкага (цяпер раён опернага тэатра, частак вул. М. Багдановіча, Я. Купалы, Старавіленскай, Траецкай набярэжнай) і Ракаўскага (вул. Ракаўская і на поўнач ад яе) прадмесцяў. У XVI ст. гарадская забудова развівалася на паўднёвы ўсход і паўднёвы захад ад замка, дзе на ўзгорыстым узвышшы фармаваліся прамавугольная сістэма вуліцаў і новы гандлёвы цэнтр – Верхні рынак (сучасная пл. Свабоды). Тут пабудаваная драўляная 2-павярховая Мінская ратуша (з XVII ст. мураваная), узводзіліся культавыя і жылыя будынкі, паступова складваўся архітэктурны ансамбль плошчы, утварыўся новы гарадскі цэнтр – Верхні горад, пашыралася яго тэрыторыя.

У сярэдзіне XVI ст. узніклі цэхі, якія аб'ядноўвалі ў XVII ст. больш за 80 спецыяльнасцяў рамеснікаў. Менскія купцы гандлявалі з Польшчай, Прыбалтыкай, Расіяй, Украінай. Вывозілі лесаматэрыялы, смалу, воск, футра, вырабы з жалеза, шкла і скуры, прывозілі соль, віно, прыправы, тканіны, металы і вырабы з іх. У горадзе рэгулярна праводзіліся кірмашы і таргі. У 1592 г. заснаванае праваслаўнае брацтва, пазней брацкая школа, да сярэдзіны XVII ст. было 7 брацтваў, адно з буйнейшых – Петрапаўлаўскае (створанае ў 1612–1614 гг.).

Вялікія разбурэнні, страты прычынялі гораду войны і інш. бедствы. У 1505 г. Менск часткова спалены крымскімі татарамі. Пажары 1547, 1552, 1569 гг. знішчылі амаль усю драўляную забудову, вялікім бедствам быў пажар 1694 г. Значныя спустошэнні прынеслі руска-польская вайна 1654–1667 гг. (так званы «патоп»; засталося 2 000 жыхароў, прыкладна 300 дамоў) і Паўночная вайна 1700–1721 гг., калі горад у 1708 г. захапілі шведы. У XVII ст. цэнтр пачалі забудоўваць мураванымі жылымі дамамі, ставілі манументальныя культавыя будынкі ў стылі барока: у Верхнім горадзе касцёл і кляштар дамініканцаў, касцёл і кляштар бернардзінак, касцёл і кляштар бернардзінцаў, касцёл і кляштар бенедыкцінак, касцёл і кляштар францысканцаў, царква Святога Духа і базыльянскія манастыры, у раёне Ніжняга рынку Петра-Паўлаўскую царкву, Петра-Паўлаўскі манастыр (1618), на Траецкай гары царкву Ушэсця (1620). Горад значна разросся ў паўднёвым і заходнім напрамках, у XVII ст. зробленыя ўмацаванні – роў і земляны вал з бастыёнамі. У XVIII ст. на Верхнім рынку закончанае будаўніцтва комплексу касцёла і кляштара езуітаў у стылі барока, на плошчы і навакольных вуліцах пабудаваныя мураваныя жылыя дамы і грамадскія будынкі, у т.л. гарадская сядзіба Ваньковіча, гарадскі тэатр, на Траецкай гары – манументальныя Ушэсця і Траецкі манастыры, манастыры з касцёламі баніфратаў (1700), кармелітаў (1703), бенедыкцінцаў (1764), марыявітак – «Дом марыявітак» (1771).

З 1793 г. горад у складзе Расійскай імперыі, адміністрацыйны цэнтр Мінскай губерні. У 1796 г. – каля 1 000 дамоў, 5 800 жыхароў, у 1800 г. – 6 700 жыхароў, галоўная вул. – Няміга.

У пачатку XIX ст. скапаныя гарадскія абарончыя збудаванні XVII ст., выпрастаны шэраг вуліцаў, адкрыты губернатарскі сад (сучасны дзіцячы парк). Паводле плана 1817 г. горад развіваўся ў паўднёва-ўсходнім напрамку. Узніклі новыя вуліцы – Захар'еўская (сучасныя праспект Незалежнасці і вул. Савецкая), Падгорная (вул. К. Маркса), Магазінная (вул. Кірава). У гэтай частцы горада кварталы мелі выразную прамавугольную форму з геаметрычнай сеткай вуліцаў. Падоўжаныя старыя вуліцы, якія ішлі ад пл. Верхні рынак: Губернатарская (з XVII ст. называлася Францысканская, сучасная вул. Леніна), Багадзельная (ранейшая назва Феліцыянская, сучасная вул. Камсамольская), Петрапаўлаўская (ранейшая назва Дамініканская, сучасная вул. Ф. Энгельса), Праабражэнская (з XVI ст. Зборавая, частка сучаснай вул. Інтэрыяцыянальнай).

Рост горада на некаторы час затрымала вайна 1812 г. За час акупацыі напалеонаўскімі войскамі (з 08.07 да 16.11.1812) значна скарацілася насельніцтва горада: з 11 200 чалавек у 1811 г. да амаль 3 500 чалавек на канец 1812 г. Пасля пажару 1835 г. цэнтр забудоўваўся мураванымі 2- і 3-павярховымі дамамі. Да сярэдзіны XIX ст. чвэрць будынкаў мураваныя, забрукаваныя 22 вуліцы, у т.л. Захар'еўская, Койданаўская, Замкавая.

(Працяг артыкула ў наступным нумары)

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6.
Тэл. 283 28 26, 334 61 62.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 07.03.2013
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.
Заказ 178.
Тыраж 1090 асобнікаў.